# АСПЕКТЫ АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ У БІЗНЕС-АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Кастрамінава Вольга Мікалаеўна**
Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў

На тэрыторыі Беларусі размешчана вялікая колькасць гістарычных будынкаў, у тым ліку помнікаў архітэктуры, якія патрабуюць аператыўнага рэвіталізацыйнага ўмяшальніцтва з боку зацікаўленых інвестараў. На жаль, сучаснае выкарыстанне старажытных сядзібна-паркавых комплексаў не заўсёды эфектыўна, а навакольныя прыродныя ландшафты паступова прыходзяць у заняпад. Некаторыя помнікі архітэктуры выкарыстоўваюцца як адміністрацыйныя і медыцынскія ўстановы, установы адукацыі і культуры, турыстычна-рэкрэацыйныя аб'екты, а частка з іх знаходзіцца без належнага гаспадарчага ўтрымання.

Рэальная практыка рэстаўрацыі і ўвядзенне ў эканамічны зварот такіх гісторыка-культурніцкіх аб'ектаў пры апісальнай сістэматызацыі можа даць добрую сотню кейсаў, якія адлюстроўваюць актуальнасць пытання аб альтэрнатывах вырашэння праблемы захавання і выкарыстання помнікаў архітэктуры ў межах эканамічных магчымасцяў Рэспублікі Беларусь.

Адвольна ўзяты бізнес-кейс у дадзенай сферы можа ахапіць любы рэгіён Беларусі і будзе садзейнічаць выпрацоўцы навыкаў прыняцця кіраўнічых і фінансавых рашэнняў, як у тэорыі, так, пры жаданні, і на практыцы.

На сённяшні дзень уласнікі некаторых сядзібна-паркавых комплексаў (мясцовыя органы ўлады) гатовыя аддаць такія аб'екты за невялікі кошт для гаспадарчага выкарыстання пры ўмове рэстаўрацыі пабудоваў і рэгенерацыі ландшафтаў. Па ступені прыярытэтнасці матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, у т.л. сядзібы, падзяляюцца на пяць груп: "А", "Б", "В", "Г" і "Д", па кожнай з якіх фармуюцца асобныя пералікі мерапрыемстваў па рэстаўрацыі, што ў сваю чаргу выводзіць спецыяльную структуру кейса, якая валодае патэнцыялам для вядзення адукацыйнай дыскусіі.

Такая структура базуецца на лакальным матэрыяле, што прадугледжвае прэзентацыю вопыту суб'ектаў гаспадарання, якія прысутнічаюць ў тым ці іншым выглядзе на нацыянальным рынку. Пры абмеркаванні разглядаемых кейсаў існуе рэальная мажлівасць выезду на мясцовасць для збору неабходнай інфармацыі, статыстычных матэрыялаў, звестак аб стане рынку, сацыяльна-эканамічных характарыстыках адвольнага суб'екта гаспадарання, удзеле ў летніках па правядзенню непасрэдных працаў на аб'екце архітэктуры разам са спецыялістамі-рэстаўратамі, будаўнікамі і валанцёрамі.

У матэрыялы кейсаў абавязкова ўключаюцца фотаматэрыялы, дакументы, датычныя помнікаў архітэктуры, публіцыстычныя крыніцы, гістарычныя даведкі, фармалізаваная вусная гісторыя мясцовых жыхароў, відэазапісы ды іншыя сведчанні, якія надаюць разглядаемай у кейсе сітуацыі добрую фабулу з драматычнай завязкай. З гэтага вынікае відавочная

культуралагічная функцыя бізнес-адукацыі як сістэмы, што стымулюе маральнае развіццё асобы.

Метадычная распрацоўка і непасрэднае выкарыстанне у бізнес-адукацыі кейсаў, датычных праблемы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, будзе садзейнічаць стварэнню дзелавой эліты шырокага профілю, здольнай працаваць ва ўмовах рынкавай эканомікі з улікам выбранай і неабходнай канцэпцый стратэгічнага развіцця. У сваю чаргу такая эліта зможа належным чынам захаваць і эфектыўна рэвыкарыстаць спадчыну роднай зямлі.